ISSN 2351-6658
ISSN (ONLINE) 2351-6666

АЗ, БУКІ, ВЕДЗІ… “БУМ-БАМ-ЛІТ”: ТВОРЧАЯ ЭВАЛЮЦЫЯ НЕФАРМАЛЬНАГА ЛІТАРАТУРНА-МАСТАЦКАГА РУХУ

АРЦЁМ КАВАЛЕЎСКІ

Анатацыя: Разгледжаны станаўленне, фармаванне і эвалюцыя літаратурна-мастацкага руху “Бум-Бам-Літ” у сучасным літаратурным працэсе Беларусі, а таксама ўдзел яго сяброў у фармаванні новай авангарднай прасторы постсавецкай айчыннай літаратуры.

Ключавыя словы: “Бум-Бам-Літ”, літаратурны працэс, авангард, эвалюцыя, паэзія.

A, B, C... “BOOM-BAM-LIT”: A CREATIVE EVOLUTION OF THE INFORMAL LITERARY AND ARTISTIC MOVEMENT

Abstract: Belarusian literary and artistic group “Boom-Bam-Lit” is a focus of this article. The author investigates the phenomenon of “Bum-Bam-Lit”, the ways of concepts and evolution of this literary and artistic group as the leading school in the forming of a contemporary Belarusian literature.

Keywords: Boom-Bam-Lit, Literary Process, Avant-Garde, Evolution, Poetry.

Афіцыйнай датай стварэння літаратурна-мастацкага руху “Бум-Бам-Літ” трэба лічыць 25 чэрвеня 1995 года, калі ў парку імя Горкага ў Мінску адбылася акцыя беларускіх літаратараў “Форматворы “Бум-Бам-Літа”. Аднак, нягледзячы на тое, што гэта мерапрыемства стала зыходным пунктам руху, зараджаўся ён на некалькі гадоў раней.

Серж Мінскевіч у сваёй кнізе “Я з Бум-Бам-Літа” зазначае, што афармленне руху пачало здзяйсняцца яшчэ падчас працы ў газеце “Культура” сяброў-калег-літаратараў Юрася Барысевіча, Іллі Сіна, Алеся Туровіча, а таксама тых, хто перыядычна заходзіў у госці: Альгерда Бахарэвіча, Усевалада Гарачкі, Міхася Башуры і Змітра Вішнёва. У той жа час Валянцін Акудовіч, якога ўдзельнікі руху называюць “хросным бацькам “Бум-Бам-Літа”, вёў у газеце “Літаратурна-філасофскі сшытак “ЗНО”, у якім ён друкаваў творы авангардных, андэграўндных аўтараў з “нетрадыцыйнай” эстэтычнай арыентацыяй. Тады ж, у 1995 годзе, былі надрукаваныя маніфесты “Бум-Бам-Літа” кожным з яго ўдзельнікаў. Менавіта з гэтай падзеі і пачалася публічная вядомасць руху (Мінскевіч, 2008).

Ад самага пачатку свайго стварэння “Бум-Бам-Літу” (ББЛ) была ўласцівая атмасфера творчай разняволенасці, канцэптуальнай хаатычнасці ды эпатажнага флёру з яго напаўмаргінальным ваганнем паміж літаратурнай прысутнасцю і сталым жаданнем уцёкаў ад усяго таго, што прынята лічыць прыгожым пісьменствам. Эклектычнасць мастацкіх пазіцый руху была відавочная: бадай кожны ўдзельнік меў за абавязак тэарэтычна абгрунтаваць тыя творчыя прынцыпы, якім аддаваў перавагу і якімі кіраваўся ў працэсе стварэння сваіх тэкстаў (ды іншых мастацкіх прадуктаў). Так, з “прыходам” у ББЛ новых удзельнікаў метадалагічная скарбонка руху, у якой ужо і без таго было шмат разнастайных “ізмаў”, узбагачалася шматлікімі спробамі канцэптуалізацыі ўласнай творчасці, увасобленымі ў форме зыходных маніфестаў. Менавіта гэтая падзея для некаторых бумбамлітаўцаў рабілася зыходным пунктам суіснавання ў руху. Іншая справа – непасрэдны ўдзел у жыцці ББЛ.

Цяжка не пагадзіцца з меркаваннем, што прыналежнасць творцы да пэўнай суполкі, згуртавання альбо руху – з’ява часовая і ў некаторай ступені непазбежная. Калі больш пільна ўгледзецца ў мастацкі вопыт ББЛ, немагчыма пазбегнуць рэфлексіі над тым творчым матэрыялам, які ўдзельнікі руху намагаліся ўвасобіць у досыць правакацыйных, але часам вельмі наіўных формах. Асабліва гэта тычылася тэарэтычнага боку творчасці, які ББЛ ніколі не пакідаў па-за ўвагаю. Цытацыя і некрытычнае перайманне чаго і каго заўгодна з набытку сучаснага агульнагуманітарнага мыслення ў творах некаторых аўтараў руху, прыпраўленыя інсітным адчуваннем сучаснай эстэтыкі, выключна

інтуітыўным (а таму і ўяўна пераканаўчым) поглядам на сучаснае мастацтва, імкненне ўвасобіць свае пазалітаратурныя прыхільнасці ў слоўнай творчасці часам падаюцца вельмі штучнымі і сумнеўнымі (лебедзь, рак і шчупак). Але разам з тым менавіта гэта і падкупляе! Прынцып гульні, памножаны на жаданне ўсеагульнай канцэптуалізацыі і максімальнай свабоды, надта прыцягальны і прывабны для маладога творцы, не прыгнечанага заштампаванымі, кандовымі вызначэннямі мастацтва. ББЛ, па вялікім рахунку, заўсёды ўяўляўся тым вольным прасцягам (менавіта прасцягам, а не суполкай, групоўкай, нарэшце, рухам), дзе можна раз і назаўсёды пазбавіцца эстэтычнай закамплексаванасці ў самым шырокім яе разуменні. На жаль (а можа, і на шчасце), perpetuum mobile яшчэ ніхто не вынайшаў. Вандроўка на прасцягу, хай сабе і вельмі прывабным, не можа быць бясконцай... Вяртанне наканавана амаль кожнаму. Але, каб вярнуцца, трэба, безумоўна, мець сілы. Іншае пытанне: куды вяртацца?...

Руху споўнілася дваццаць гадоў... Адзін са сваіх юбілеяў неўтаймаваныя авангардысты адзначылі тыпова па-бумбамлітаўску, абвясціўшы канчатковую смерць суполкі, што ўвасобілася ў тэматычнай акцыі “Хаўтуры па ББЛ”. Што гэта: чарговы эпатажны жэст альбо сведчанне іранічнага стаўлення да ўласнай экзістэнцыі? Шчыра кажучы, наўрад ці можна лічыць нядаўнія “хаўтуры” прызнаннем смерці альбо знікнення руху з нацыянальнага літаратурна-мастацкага працэсу. “Хаўтуры” – гэта толькі чарговая ўдалая акцыя ББЛ, якая, як ні парадаксальна, засведчыла досыць вялікую папулярнасць руху сярод публікі, што цікавіцца сучасным мастацтвам (хоць, вядома, у нашай краіне абрад хаўтураў заўсёды збіраў грамаду выпадковых разявакаў). Зразумела, што, паклаўшы руку на сэрца, нікому з сённяшніх, а таксама былых “зрухароў” не хочацца пакінуць і назаўсёды расстацца з такім раскручаным брэндам, як ББЛ. Нават суполка Schmerzwerk, якая фактычна з’явілася спадкаемцай ББЛ, не дасягнула ўзроўню папулярнасці руху, які вось ужо некалькі год перманентна канае (як бачым, не заўсёды першы блін камяком). ББЛ як праект, праект удалы і вядомы, яшчэ доўга будзе актуальным, нават калі актуальнасць гэтая паспрыяе паступовай “рэінкарнацыі” праекта. Але не трэба забывацца на асобасную творчую стомленасць аўтараў, якія дагэтуль нясуць на сабе цяжар колішняй заангажаванасці руху.

Калі казаць пра найвялікшае дасягненне ББЛ, то тут шмат чаго можна прыгадаць. Выступаючы ў Кракаве па запрашэнні студэнцкай арганізацыі Ягелонскага ўніверсітэта “Koło wschodnie” з лекцыяй “Бум-Бам-Літ”: 10 год гульні без правілаў”, я даводзіў польскай аўдыторыі, што ББЛ – гэта фактычна першая літаратурна-мастацкая арганізацыя

на Беларусі, якая ў сваёй дзейнасці замяніла традыцыйнае паняцце стэрэатыпа на плюралістычнае паняцце стэрэагусту* (што ў прынцыпе не ўласціва беларускаму менталітэту) за кошт свядомай эклектычнасці і наўмыснай разгалінаванасці творчых канцэпцый. Па-другое, гэта свядомае далучэнне руху да агульнаеўрапейскага літаратурна-мастацкага працэсу. Дагэтуль амаль ніхто з беларускіх літаратараў (за рэдкім выключэннем) так актыўна не ўдзельнічаў у міжнародных фестывалях, акцыях, не выдаваў супольных літаратурных зборнікаў, не дэманстраваў айчынную творчасць за мяжою. Безумоўна, ББЛ тут па-за канкурэнцыяй. І, нарэшце, як ні пафасна гэта гучыць, актыўная папулярызацыя рухам айчыннай літаратуры (роднай мовы) сярод беларускай моладзі. Дзякуючы выступам бумбамлітаўцаў маладая грамада зразумела, што сучасная беларуская літаратура – гэта *cool,* а пісаць і размаўляць па-беларуску – модна. Што тычыцца паразаў, а дакладней пралікаў, руху, якія, безумоўна, былі, то тут у першую чаргу трэба звярнуць увагу на перанасычанасць ідэямі, якія вялі фактычна да пазаканцэптуальнасці творчых падыходаў і пэўнай блытаніны ў філасофскай метадалогіі руху. Не спраўдзілася таксама спроба постмадэрнісцкага пазіцыянавання руху, бо фармальныя пошукі ў большасці творчых праектаў удзельнікаў ББЛ мелі пад сабою выключна мадэрнісцкую глебу, што ў прынцыпе зусім натуральна, калі ўлічыць, што “новую” літаратуру некаторыя ідэолагі руху бачылі па-за ўласна літаратурным дыскурсам.

Сёння ўдзельнікі руху “Бум-Бам-Літ” займаюцца індывідуальнай творчасцю па-за рамкамі руху. Што тычыцца самаго ББЛ, то Віктар Жыбуль лічыць, што насамрэч “Бум-Бам-Літ” ні жывы, ні мёртвы. У яго няма ні пасведчання аб нараджэнні, ні аб смерці. Але ў кожнага ёсць свая тэрыторыя творчай свабоды, і кожны абжывае яе згодна са сваімі пажаданнямі (Мінскевіч, 2008).

Бібліяграфія

1. Аймермахер, К. (1997). *Знак. Текст. Культура.* М.: Дом интеллектуальной книги.

2. Акудовіч В. В., З. Ю. Вішнёў і інш (1998). *Тазік беларускі:* Зб. вершаў. Мн.: “Бервіта”.

3. Блум, Хэролд (1998). *Страх влияния. Карта перечитывания.* Екатеринбург: Изд-во Уральского университета.

4. Мінскевіч, С. (2008). *Я з Бум-Бам-Літа.* Мінск: Логвінаў.